Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 17. Варыянт 6. Ч.1**

## Білет 17. Практычнае заданне. Станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Удзел БССР у стварэнні СССР. Узбуйненне тэрыторыі БССР.

**Заданні склала:**Самарцава Таццяна Мікалаеўна, ДУА "Сярэдняя школа № 8 г.Магілёва"

**Пытанні**

1. З апорай на гістарычную карту вызначыце гістарычную падзею. 2 ўзровень
2. Абапіраючыся на тэкст Канстытуцыі Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі, укажыце носьбіта вышэйшай улады ў дзяржаве і асноўныя задачы дзяржавы. 3 ўзровень
3. Карыстаючыся матэрыяламі ілюстраванага атласа гісторыі Беларусі, карты і тэксту Канстытуцыі, раскажыце пра гістарычную падзеюРастлумачце свой адказ. (4 ўзровень)
4. А) Прааналізуйце ўклад гістарычнай асобы з крыніцы 2 у гісторыю Беларусі 5 ўзровень

Б) Растлумачце, чаму бальшавікі былі вымушаны двойчы абвяшчаць БССР. Як гэты гістарычны феномен сведчыць пра стаўленне Масквы да беларускага пытання.

**Крыніца 1**

**Адукацыя ССРБ і ЛітБелССР**



Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Крыніца 2**Старонка ілюстраванай храналогіі гісторыі Беларусі. Мінск 1998 г.




**Крыніца 3**
**З Канстытуцыі Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі**1919 г.

«1. Беларусь аб'яўляецца Рэспублікай Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Уся ўлада ў цэнтры і на месцах належыць гэтым Саветам.

2. з'езд Саветаў пастанаўляе:

а) прыватная ўласнасць на зямлю адмяняецца, і ўвесь зямельны фонд аб'яўляецца агульнадзяржаўнай уласнасцю;

б) усе лясы, нетры і воды, а таксама і ўвесь жывы і мёртвы інвентар, паказальныя гаспадаркі і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы аб'яўляюцца нацыянальнай уласнасцю;

в) у мэтах знішчэння паразітычных пластоў грамадства і арганізацыі гаспадаркі ўводзіцца ўсеагульны працоўны абавязак.

7. У мэтах забеспячэння за працоўнымі сапраўднай свабоды сумлення царква адлучаецца ад дзяржавы і школа ад царквы, а свабода рэлігій і антырэлігійнай прапаганды прызнаецца за ўсімі грамадзянамі.

11. У мэтах забеспячэння за працоўнымі гэтага доступу да ведаў ССРБ ставіць сваёй задачай прадаставіць працоўным і найбяднейшым сялянам поўную і ўсебаковую бясплатную адукацыю.

13. У мэтах абароны заваёў вялікай рабоча-сялянскай рэвалюцыі ССРБ прызнае абавязкам усіх грамадзян рэспублікі абарону сацыялістычнай

айчыны і ўстанаўлівае ўсеагульны воінскі абавязак. Ганаровае права абараняць рэвалюцыю са зброяй у руках даецца толькі працоўным, на непрацоўныя ж элементы ўскладаюцца іншыя воінскія абавязкі.

15. ССРБ прызнае роўныя правы за грамадзянамі, незалежна ад іх расавай і нацыянальнай прыналежнасці. »

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Адказы:**

**1.**Стварэнне ССРБ 1.01.1919 г. У Смаленску (спасылка на карту). і ЛітБел 2-3.02.1919г.

**2.**Уся ўлада ў цэнтры і на месцах належыць Радам працоўных, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. З'езд Саветаў пастанаўляе:

- прыватная ўласнасць на зямлю адмяняецца.
- уводзіцца ўсеагульны працоўны абавязак.
- царква аддзяляецца ад дзяржавы і школа ад царквы, а свабода рэлігій і антырэлігійнай прапаганды прызнаецца за ўсімі грамадзянамі.
- прадаставіць працоўным і найбяднейшым сялянам поўную і ўсебаковую бясплатную адукацыю.
- абавязкам усіх грамадзян рэспублікі абарону сацыялістычнай айчыны і ўстанаўлівае ўсеагульны воінскі абавязак.
- ССРБ прызнае роўныя правы за грамадзянамі, незалежна ад іх расавай і нацыянальнай прыналежнасці

**3.**Стварэнне савецкай дзяржаўнасці адбывалася ў 1919 годзе і 1920г. У 1924 і 1926 гг узбуйненне тэрыторыі ССРБ. У газеце "Савецкая Беларусь" надрукавана Дэкларацыя абвяшчэння незалежнасці ССРБ 1920 г. Вышэйшым Органам улады стаў ЦВК, размяшчаўся ў будынку на плошчы Свабоды ў Мінску. Д.Жылуновіч - першы кіраўнік дзяржавы. Выходзіў часопіс « Чырвоная Беларусь

**4**. А) Беларускі пісьменнік, паэт і драматург, журналіст, рэдактар. Кіраўнік Часовага абуча-сялянскага ўрада Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі - сакратар Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкама) пры ўрадзе РСФСР, член беларускай секцыі РКП(б), рэдактар газеты "Дзянніца". Вёў барацьбу за стварэнне Беларускай Рэспублікі супраць Вільгельма Кнорына і Аляксандра Мяснікова, якія не прызнавалі беларусаў самастойнай нацыяй, знайшоў падтрымку ў У. І. Леніна і І. В. Сталіна. З дня стварэння Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь (1 студзеня 1919 г.) да 3 лютага 1919 г. быў кіраўніком Часовага абочэй-сялянскага ўрада Савецкай Беларусі. З 3 сакавіка 1919 года - рэдактар і сакратар газеты "Чырвоная зара" (Харкаў), і з чэрвеня палітработнік у штабе 14-й арміі. У 1920 годзе - галоўны рэдактар газеты "Работніцка-сялянская Беларусь". Рэпрэсаваны. Рэабілітаваны пасмяротна. Помнік на месцы гібелі ў Магілёве.

Б) Упершыню Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка была абвешчана ў Смаленску 1 студзеня 1919г. у выніку грамадзянскай вайны. Потым была савецка-польская вайна. БССР часова аб'ядналася з Літвой у ЛітБел ССР. У другі раз БССР была абвешчана 31 ліпеня 1920г., у межах толькі Мінскай губерні, у сувязі з вызваленнем